УДК УДК 821. 161.

***А.С. Кавалюк***
*канд. філал. навук, дац., дац. каф. беларускага літаратуразнаўства*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна*

# БЕЛАРУСКАЯ ВАЕННАЯ ПРОЗА XX СТАГОДДЗЯ: ГЕНЕЗІС, СТРАТЭГІІ МАСТАЦКАЙ ТЫПІЗАЦЫІ, ПРАБЛЕМА ІНТЭРПРЭТАЦЫІ

*У артыкуле даследуецца генезіс, стратэгіі мастацкай тыпізацыі беларускай ваеннай прозы XX стагоддзя, асэнсоўваецца яе інтэрпрэтацыя сучаснымі літаратуразнаўцамі.*

Асэнсоўваючы літаратуру па тэме, мы сустрэлі палемічныя, на наш погляд, меркаванні даследчыкаў, накшталт: «Проза о войне и военная проза – не одно и то же. Проза о войне может быть и фальсифицированной, и идеологизированной» [2]. На думку аўтара выказвання, ваенная проза – гэта тое, што было напісана ў 60-я гг. XX ст., «такое явление, как “шестидесятническая военная проза”».

А. Бязлепкіна ў кнізе «100 слоў пра сучасную беларускую літаратуру», справядліва адзначаючы, што ваенная тэма «адна з найбольш распрацаваных тэм у беларускай літаратуры, яе традыцыі закладзены М. Гарэцкім, К. Чорным, М. Лыньковым», лічыць, што «ваенная проза – проза пра падзеі, звязаныя з Другой сусветнай (1939–1945) і Вялікай Айчыннай вайной (1941–1945)» [1, с. 35]. Адпаведна з такім вызначэннем у развіцці ваеннай прозы даследчыцай вылучаюцца і характарызуюцца тры перыяды:

*«1940–1950-я гг.* – павярхоўны паказ вайны, творы напісаны ў рэчышчы сацрэалізму (тэорыя ідэальнага героя і тэорыя бесканфліктнасці). Лёс чалавека разглядаўся ў кантэксце лёсаў яго суайчыннікаў (кніга дзіцячых успамінаў “Ніколі не забудзем”, дакументальныя запісы Я. Коласа, М. Лынькова, Я. Брыля, І. Мележа). Герой ваеннай прозы – просты і мужны чалавек, часцей селянін.

*Канец 1950-х – 1970-я гг.* – аўтабіяграфічнасць і псіхалагізм, менш схематызму, вайна стала фонам для вырашэння глабальных праблем чалавечага існавання, паказу трансфармацыі свядомасці ў крытычных умовах, што набліжала творы да філасофіі экзістэнцыялізму. Герой ваеннай прозы – адукаваны малады чалавек, які абвострана ўспрымае свет (“Нельга забыць” У. Караткевіча; “Птушкі і гнезды” Я. Брыля; “Сасна пры дарозе” і “Вецер у соснах” І. Навуменкі). Аб’ект аналізу літаратуры – маральны аспект (“Круглянскі мост”, “Абеліск” В. Быкава), пытанні волі і адказнасці, праблема абставін і выбару чалавека (“Сотнікаў” В. Быкава). Адначасова пераадольваецца перадузятасць у стаўленні да ворагаў (“Пушчанская адысея” А. Карпюка; “Птушкі і гнёзды”, “Дваццаць” Я. Брыля; “Альпійская балада” В. Быкава), паказваюцца неадназначныя паводзіны тых, хто змагаўся супраць фашыстаў. Даследуецца псіхалогія ворага (“Хатынская аповесць”, “Карнікі” А. Адамовіча; “Тартак”, “Найдорф” І. Пташнікава), чалавечае і нечалавечае асэнсоўваюцца праз зварот да вобразаў жывёл (“Суд у Слабадзе” В. Казько).

*1980–2000-я гг.* – перагляд і пераасэнсаванне ваенных падзей (В. Быкаў, І. Шамякін, І. Чыгрынаў, І. Навуменка, А. Адамовіч). У творах закранаецца праблема гістарычнай амністыі, лёсу народа (“Бежанцы” В. Карамазава). Вайну паказваюць асучаснена, у кантэксце гісторыі XX ст., з улікам інфармацыі, атрыманай аўтарамі ў пазнейшы час (“Не ўсе мы згінем” І. Чыгрынава і “Пакахай мяне, салдацік” В. Быкава). Даследуецца калабаранцкі рух, вайна разглядаецца як грамадзянская: па розныя бакі ваявалі прадстаўнікі аднаго народа (“Голас крыві брата твайго” В. Адамчыка; “Вяртанне да віны” і “Не ўсе мы згінем” І. Чыгрынава; “Пятнаццаць лішніх хвілін” С. Балахонава), партызан паказваюць не толькі як герояў (“Сорак трэці” І. Навуменкі, “Сцюжа” В. Бы-

кава, “Нязрушаны камень” В. Адамчыка), шукаюць вобраз “добрага немца” А. Адамовіч, Я. Брыль “Я з вогненнай вёскі” У. Калесніка, “Палон” і “У падзямеллі” М. Аўрамчыка, “Немой” А. Адамовіча), выяўляюцца праблемы жыцця “маленькага” чалавека ва ўмовах вайны (“Знак бяды” В. Быкава). Заглыбленне ў псіхалогію людзей ва ўмовах вайны прыводзіць пісьменнікаў да высновы: пра маральныя якасці чалавека нельга меркаваць толькі па яго прыналежнасці да пэўнага боку, бо трэба ведаць, чым ён кіраваўся, робячы свой выбар. Неадназначным ёсць вырашэнне пытанняў маральнасці ў перыяд вайны, бо амаль немагчыма захаваць сваё жыццё і не парушыць маралі, і таму з’яўляецца пачуццё сораму і вінаватасці ў адносінах да тых, хто загінуў на вайне (“Кар’ер” В. Быкава). Роздум пераважае над эмоцыямі, тэксты маюць хрысціянскую і гуманістычную скіраванасць, героямі твораў становяцца святары (“Будзь воля Твая” І. Жарнасек)» [1, с. 35–36].

Мы невыпадкова прыводзім такую вялікую цытату з працы А. Бязлепкінай: не ва ўсім можам пагадзіцца з даследчыцай. Сумненні выклікае прапанаваная перыядызацыя, зместавае напаўненне перыядаў, некаторая трактоўка твораў. Не зусім апраўданым бачыцца аб’яднанне ў першым перыядзе 1940-х і 1950-х гг., бо ўжо ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны былі створаны раннія апавяданні І. Мележа, І. Шамякіна, апавяданні К. Чорнага і М. Лынькова, ваенныя раманы К. Чорнага, ролю якіх у гісторыі нацыянальнай прозы цяжка пераацаніць. І ў гэтым плане многае з напісанага ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе аказалася значна слабейшым, чым створанае ў гады вайны. Аўтарам не згадваюцца творы, якія шмат у чым выяўляюць этапы распрацоўкі ваеннай тэмы ў беларускай літаратуры (раманы «Мінскі напрамак» І. Мележа, «Глыбокая плынь» І. Шамякіна, «Векапомныя дні» М. Лынькова, інш.). Не зусім зразумела, што літаратуразнаўца ўкладвае ў фармулёўкі *«чалавечае і нечалавечае асэнсоўваюцца праз зварот да вобразаў жывёл (“Суд у Слабадзе” В. Казько)»* або *«А. Адамовіч, Я. Брыль “Я з вогненнай вёскі” У. Калесніка»* (курсіў наш – *А.К.*). У вызначэнне А. Бязлепкінай паняцця «ваеннай прозы» не ўключаюцца ні антываенныя творы М. Гарэцкага, ні творы пра вайну ў Афганістане беларускіх пісьменнікаў.

Мы схіляемся да традыцыйнага меркавання, што заснавальнікам ваеннай прозы ў беларускай літаратуры з’яўляецца М. Гарэцкі. У драматычны для Беларусі час войнаў і рэвалюцый пачатку ХХ ст. пісьменнік стаў летапісцам лёсавызначальных для краіны гістарычных падзей. Грамадска-палітычнымі фактарамі, якія паўплывалі на ідэйна-мастацкія пошукі і светапоглядную эвалюцыю пісьменніка, сталі падзеі Першай сусветнай вайны. М. Гарэцкі ваяваў, на працягу чатырох гадоў не меў свайго прытулку, аднак і ў гэтых неспрыяльных умовах ён пісаў будучую дакументальна-мастацкую кнігу «На імперыялістычнай вайне», надрукаваную ў 1926 г. Твор заснаваны на біяграфічных фактах (М. Гарэцкі апісаў сваю службу ў царскай арміі, занатаваў успаміны з франтавога жыцця), пераканаўча сведчыць, якое гэта пекла – вайна. Пісьменнік, усведамляючы бессэнсоўнасць імперыялістычнай вайны, паказанаў яе як вялікую, агульнанародную бяду. Дакументальныя запіскі «На імперыялістычнай вайне» сталі пачаткам ваеннай і дакументальна-мастацкай прозы ў беларускай літаратуры ХХ ст., таму і займаюць ў нацыянальным слоўным мастацтве адметнае месца. Крытыка слушна адзначала «глыбокую праўдзівасць і жанравае наватарства (форма дзённіка)» твора. Рабіліся спробы разглядаць яго «ў кантэксце еўрапейскай антываеннай літаратуры (параўнанне з вядомым раманам А. Бярбюса “Агонь”») [6, с. 408].

Антынародная сутнасць вайны праз лёс канкрэтнага чалавека паказана ў аповесці М. Гарэцкага «Ціхая плынь» і апавяданнях «Літоўскі хутарок», «Рускі», «Генерал», «На этапе» і інш. Тэма вайны не зводзілася пісьменнікам толькі да праўдзівага ўзнаўлення франтавога жыцця, ён пераносіў дзеянне ў мірнае асяроддзе. Мастак-гуманіст не толькі шчыра спачуваў сваім героям як ахвярам несправядлівага сацыяльнага ладу,

ахвярам злой вайны, але і гаварыў пра асабістую адказнасць чалавека. У гэтым таксама выявілася наватарства М. Гарэцкага ў асэнсаванні ваеннай тэмы.

Прадаўжальнікам традыцый М. Гарэцкага стаў Кузьма Чорны. Класік беларускай літаратуры ў гады Вялікай Айчыннай вайны, як сведчыць яго дзённік [8], здзейсніў сапраўдны мастакоўскі подзвіг: цяжка хворы, паўгалодны, перагружаны тэрміновай працай у журналістыцы, не маючы хоць якіх-небудзь умоў для творчай працы, напісаў каля паўсотні публіцыстычных артыкулаў, выступленняў, фельетонаў (яны склалі зборнік «Кат у белай манішцы», 1942), падрыхтаваў да друку зборнік апавяданняў «Вялікае сэрца», напісаў раманы «Пошукі будучыні» (1941–1944), «Вялікі дзень» (1941–1944), «Млечны шлях» (1944), задумаў і часткова ажыццявіў каля дзесятка эпічных твораў. У сваіх апавяданнях («Бацька», «Маленькая жанчына», «Вялікае сэрца» і інш.) пісьменнік узнавіў канкрэтныя эпізоды вайны, паводзіны звычайных «маленькіх» людзей, якія бунтоўна супраціўляліся гвалту і здзекам, здзяйснялі гераічныя ўчынкі. К. Чорны паказаў простага чалавека-патрыёта, выкрыў бесчалавечную сутнасць вайны. Ваеннай прозе пісьменніка ўласціва ўменне перадаваць з’явы рэчаіснасці, паказваць складанасць унутранага свету герояў і раскрываць ролю чалавека ў гістарычным працэсе.

На думку М. Тычыны, раманы ваеннага часу Кузьмы Чорнага былі выключнымі ў гісторыі сусветнай літаратуры, так як «у мастацка-філасофскім асэнсаванні эпохі беларускі пісьменнік апярэджваў многія вядомыя творы, такія, як раманы “Чума” Альбера Камю і “Доктар Фаустус” Томаса Мана, дзе ўздымаліся фундаментальныя праблемы чалавечага існавання» [7, с. 360].

М. Мішчанчук небеспадстаўна адзначыў, што раманы названага перыяду непадобныя да раней напісаных твораў: «Сацыяльныя праблемы адышлі на другі план, а на першы вылучыліся агульначалавечыя» [5, с. 107]. Літаратуразнаўца звярнуў увагу на тое, што ў творах Чорнага ваенных гадоў на ўсю моц загучалі гуманістычныя ідэі, занядбаныя ў гады сталіншчыны. М. Мішчанчук адчуў занепакоенасць пісьменніка духоўным падзеннем чалавецтва. Таму, на яго думку, душа Кузьмы Чорнага ўсё больш поўнілася пачуццём вялікага замілавання да простага беларускага чалавека.

Героі Кузьмы Чорнага – сумлічане ў рамане «Пошукі будучыні», «ціхія сумленнікі” ў рамане «Вялікі дзень», найменне якіх даследчыкі звязваюць з беларускім словам «сумленне». Ці не сумленнем нацыі са старонак «Пошукаў будучыні» паўстаюць Юрась Нявада, Волечка Нявада, Кастусь Лукашэвіч, Сымон Ракуцька? Іх надзяліў пісьменнік лепшымі рысамі нацыянальнага характару, праз іх вобразы апаэтызаваў харaство беларускай душы, якая, па меркаванніі М. Тычыны [7, с. 362], у гады вайны ўбачылася Кузьме Чорнаму з асаблівай вастрынёй і болем. Здзіўляе, што не быўшы ўдзельнікам Вялікай Айчыннай, пісьменнік не проста асэнсаваў яе ў сваіх творах, але і ўзняўся да філасофскага асэнсавання вайны як агульначалавечай трагедыі.

Тэма вайны стала на доўгі час вызначальнай у беларускай літаратуры, пашырала магчымасці псіхалагічнага і экзістэнцыяльнага асэнсавання гістарычных падзей і лёсу беларускага народа. Пісьменнікі пісалі пра радасць Перамогі, услаўлялі Радзіму, гераізм, асуджалі антыгуманную сутнасць вайны. На матэрыяле жыцця беларускага народа на акупіраванай тэрыторыі былі створаны празаічныя творы Я. Брыля, І. Грамовіча, П. Кавалёва, У. Краўчанкі, М. Лупсякова, М. Паслядовіча і інш. Тэма вайны і партызанскай барацьбы становіцца вызначальнай у раманах «Векапомныя дні» М. Лынькова, «Растаемся ненадоўга» А. Кулакоўскага, «Згуртаванасць» М. Ткачова. Нярэдка ў гэтых творах дзейнічаюць канкрэтныя гістарычныя асобы, а падзеі і факты маюць дакументальную аснову.

Літаратура першага пасляваеннага дзесяцігоддзя была шмат у чым ідэалізаванай, паказвала толькі гераічнае на вайне. У многіх творах пераважала фактаграфічная шырыня матэрыялу, падзейнасць, ім не хапала псіхалагічнай глыбіні, аналітызму, аддава-

лася пашана культу асобы. Першая кніга рамана-эпапеі «Векапомныя дні» М. Лынькова выйшла асобным выданнем у 1951 г., а наступныя дзве кнігі ў чатырох тамах – у 1958. Праз дзесяць гадоў пісьменнік стварыў новую рэдакцыю твора, якая ў 1968 г. была адзначана Дзяржаўнай прэміяй БССР. Над творам аўтар працаваў натхнёна і з вялікім душэўным напружаннем, жадаючы стварыць сваю «Вайну і мір» ці «Ціхі Дон». В. Каваленка адзначае, што наўрад ці пісьменнік задумваўся над тым, ці існавалі рэальныя ўмовы ў тагачасным грамадстве для стварэння эпасу нацыянальнага лёсу народа. І хоць твор пісаўся ў неспрыяльны перыяд развіцця беларускай літаратуры, у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе, дапісваўся напачатку «хрушчоўскай адлігі», «талент пісьменніка, энергія яго творчай думкі, сама літаратурная логіка ў многіх выпадках дазваляла пісьменніку вырывацца за гэтыя рамкі і пісаць праўду вайны, праўду народнага лёсу. Менавіта гэтымі момантамі раман "Векапомныя дні" замацаваўся ў гісторыі ваеннай прозы, у гісторыі ўсёй беларускай літаратуры» [3, с. 403]. В. Каваленка пераконвае: «Раман "Векапомныя дні" М. Лынькова, як і аповесць І. Шамякіна "Глыбокая плынь" (1949), раманы І. Мележа "Мінскі напрамак" (1952) і А. Кулакоўскага "Растаёмся ненадоўга" (1955) не толькі склалі важнае звяно ў развіцці беларускай прозы на тэму вайны. Яны накрэслілі ўжо яе новы рубеж. Але, каб гэты рубеж быў дасягнуты і заваяваны, спатрэбіліся важныя змены ў грамадскім жыцці сярэдзіны 60-х гадоў» [3, с. 411–412].

А. Яскевіч, характарызуючы ў акадэмічным выданні «Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя» літаратуру пасляваеннага дзесяцігоддзя, адзначаў, што тагачасная грамадская думка, якая «жыла абвострана класавымі ацэнкамі жыццёвых з'яў», не дала дазволу аўтару «Векапомных дзён» на «паглыблены экзістэнцыяльны аналіз агульначалавечых матывацый людскіх паводзін». Таму, яго на думку, скарацечнай аказалася слава многіх пасляваенных твораў. І колькі аўтар ні імкнуўся палепшыць свой твор, «як толькі ў перыяд грамадскага пацяплення ўзнялася рэалістычная хваля ваеннай прозы, эпапеі "Векапомныя дні" суджана было выпасці ў мастацкі пасіў, падзяліць лёс маладнякоўскай прыгодніцкай літаратуры аб грамадзянскай вайне і інтэрвенцыі на Беларусі» [9, с. 65].

Такім чынам, абмежаваная догмамі сацрэалізму, літаратура тым не менш набірала разбег і, пераадольваючы схематызм стэрэатыпных уяўленняў, дасягнула значных поспехаў у творах пісьменнікаў-франтавікоў, якія не маглі не адгукнуцца на ваенныя падзеі. У іх творах праўдзіва паказаны чалавек на вайне.

І. Мележ у літаратуру ўвайшоў яшчэ ў час вайны з багатым жыццёвым вопытам драматычнага зместу, зведаў самыя горкія старонкі вайны на фронце і гэта выявіў найперш на старонках свайго франтавога дзённіка, матэрыялы якога пазней склалі «Першую кнігу» (1976), а таксама ў апавяданнях «У завіруху» (1944), «Ноччу» (1945), «Сустрэча» (1944), «На рацэ» (1953), «Памылка» (1954), «На скрыжаванні» (1954), «Апошняя аперацыя» (1944), «Сустрэча ў шпіталі» (1944) і інш.

Пісьменнік паказаў, што вайна – гэта найперш цяжкая паўсядзённая праца. Творы І. Мележа, напісаныя ў вайну і на ваенным матэрыяле, склалі першы яго зборнік «У завіруху» (1946). Заключнаму этапу Вялікай Айчыннай вайны быў прысвечаны мележаўскі раман «Мінскі напрамак» (1949−1952), сюжэт якога разгортваецца ў двух планах: партызанская барацьба і баі, што вяла Савецкая Армія з нямецка-фашысцкімі захопнікамі падчас лёсавызначальнай аперацыі «Баграціён». І хоць сам пісьменнік быў не зусім задаволены сваім творам (пра што сведчаць пяць яго рэдакцый), але раман заняў належнае месца ў творчай эвалюцыі і самога аўтара і ў тагачаснай беларускай літаратуры. Пры яго стварэнні І. Мележ абапіраўся на лепшыя традыцыі паказу вайны А. Фадзеевым, Л. Талстым і інш.

І. Шамякін прыйшоў у літаратуру таксама ў ваенныя гады і таксама як аўтар твораў пра Вялікую Айчынную. Калі ён пачынаў сваю творчую дзейнасць, ваенная рэчаіс-

насць была для яго жывой, гарачай сучаснасцю. Яшчэ знаходзячыся ў дзеючай арміі, будучы пісьменнік часта выступаў у армейскіх газетах з карэспандэнцыямі і вершамі. У 1944 г. напісаў апавяданне «У снежнай пустыні», а ў 1945 г. – аповесць «Помста», з якіх і пачалася сур'ёзная і сталая праца І. Шамякіна ў літаратуры.

Яго раман «Глыбокая плынь» (1946–1949) – першы твор у беларускай літаратуры на партызанскую тэму – быў адзначаны Дзяржаўнай прэміяй СССР. І. Шамякін сам не быў удзельнікам партызанскай вайны, але яе добра ведалі і ўдзельнічалі ў ёй многія блізкія яму людзі. Аўтар імкнуўся раскрыць народны характар партызанскай барацьбы на тэрыторыі Беларусі. Раману, які з'яўляўся творам свайго часу, былі ўласцівы некаторыя наватарскія падыходы ў адлюстраванні ваенных падзей і нават унутраная палемічнасць у адносінах да твораў першых пасляваенных гадоў. У пенталогіі І. Шамякіна «Трывожнае шчасце» (1957–1963) шмат аўтабіяграфічнага, аднак яна раскрывае тыповыя рысы пакалення, на долю якога выпала шмат трагічных выпрабаванняў у гады Вялікай Айчыннай. Трэцяя аповесць пенталогіі «Агонь і снег» (1958) – самы глыбокі і праўдзівы твор І. Шамякіна пра вайну, дзе апісаны рэальныя падзеі з жыцця самога пісьменніка: ён служыў на Поўначы ў зенітнай артылерыі, абараняючы горад Мурманск ад налётаў нямецкай авіяцыі. У раманах «Сэрца на далоні» (1963), «Снежныя зімы» (1968), «Вазьму твой боль» (1979) сучасная плынь жыцця герояў перамяжоўваецца з успамінамі пра вайну. Ва ўсіх шамякінаўскіх творах на ваенную тэму так ці інакш прысутнічае праблема «жанчына і вайна». У аповесцях «Шлюбная ноч» (1975) і «Гандлярка і паэт» (1976) гэтая праблема стала цэнтральнай.

Па меркаванні У. Калесніка, «Я. Брыль, бадай, першы з беларускіх празаікаў намацаў абсяг і важнасць праблемы каштоўнасцей у жыцці чалавека на вайне» [4, с. 142]. Менавіта з пазіцый філасофскага вучэння аб каштоўнасцях, лічыць даследчык, можна цалкам зразумець сутнасць апавяданняў «Адзін дзень», «Маці», «Memento mori», «усвядоміць чалавечае хараство іх станоўчых герояў, маральную важнасць калізій, адчуць трагедыйную сілу ўзрушэння і ўбачыць іх наватарскую ролю ў беларускай прозе другой паловы 50-х гадоў» [4, с. 150]. У рамане «Птушкі і гнёзды» (1963), які лічыцца альтэрнатывай раманнага канону сацрэалізму, Я. Брыль даследаваў чалавеканенавісніцкую ідэалогію фашызму. Ён выкарыстаў новы для савецкай літаратуры ракурс – паказаў фашыстаў не на фронце, праз падвойную лінію акопаў, а зблізку, у звычайных, «хатніх» умовах.

Пісьменнікі-франтавікі: І. Мележ, І. Шамякін, Я. Брыль – зрабілі свой унёсак у станаўленне і развіццё ваеннай прозы ў беларускай літаратуры на аснове ўласна перажытага. Для іх ваенныя гады былі вырашальнымі ў грамадзянскім станаўленні, а франтавы, салдацкі вопыт вызначыў асновы іх мужнасці, стойкасці, сумленнасці. Тое ж тычыцца і пісьменніка-франтавіка В. Быкава, якому суджана было адыграць вызначальную ролю ў асэнсаванні ваеннай тэмы не толькі ў нацыянальнай літаратуры, але і ў савецкай. Для яго ніколі не было франтавой рамантыкі, бо В. Быкаў добра ведаў праўду вайны (быў двойчы паранены, бацькі атрымалі пахаванку, яго імя запісана на абеліску пад Кіраваградам) і лічыў, што пісаць пра яе няпраўду – гэта амаральна як перад загінуўшымі, так і перад будучымі пакаленнямі. Дарэчы, прыйшоў у «ваенную» тэму пісьменнік, пазнаёміўшыся з зададзенымі і схематычнымі творамі першага пасляваеннага дзесяцігоддзя. В. Быкаў па-новаму адлюстраваў гераізм народа на фронце і ў варожым тыле. Перажытае на вайне з'явілася для пісьменніка найважнейшай крыніцай ведання праўды вайны і праўды чалавечых паводзінаў на ёй, амаль да ўсяго, што напісаў, прычыніўся яго асабісты вопыт.

Ваенныя творы В. Быкава ўмоўна падзяляюцца на «франтавыя» (апавяданні «У першым баі», «Смерць чалавека», «Абознік», аповесці «Жураўліны крык», «Трэцяя ракета», «Дажыць да світання» і інш.) і «партызанскія» (апавяданне «Сваякі», аповесці

«Круглянскі мост», «Сотнікаў», «Пайсці і не вярнуцца» і інш.). Пісьменнік не быў партызанам, але, ствараючы «партызанскія» аповесці, лічыў, што без паказу партызанскай вайны на Беларусі будзе няпоўным аповед пра яе. З другога боку, ён быў перакананы, што менш рэгламентаванае партызанскае жыццё давала больш мажлівасцяў для выяўлення праблемы выбару – цэнтральнай у яго творчасці.

Новым этапам асэнсавання В. Быкавым ваеннай тэмы стала аповесць «Знак бяды» (1982), дзе ўдзельнікамі і ахвярамі вайны з'яўляюцца не салдаты, як у «франтавых» аповесцях, і не партызаны, як у аповесцях «партызанскага» цыклу, а мірныя жыхары. Падключыўшы да ваеннага матэрыялу паказ даваеннага жыцця з прымусовай калектывізацыяй і рэпрэсіямі, пісьменнік паказаў, што для савецкага народа вайна пачалася значна раней, чым у чэрвени 1941 года. На гэтым аспекце В. Быкаў таксама засяродзіўся ў аповесці «Сцюжа» (1993). У аповесці «Пакахай мяне, салдацік» (1996) пісьменнік па-новаму паказаў партызанскую тэму, а тэма вайны асэнсоўвалася мастаком слова ў філасофскім плане. В. Быкаў выказаў меркаванне, што фашызм і камунізм – два канцы адной палкі, і рэалістычна паказаў дзейнасць службістаў на вайне ў самай «шматпакутнай» сваёй аповесці «Мёртвым не баліць» (1966). Быкаўскія творы ваеннай тэматыкі вызначаюцца суровым рэалізмам, філасофскай заглыбленасцю, вызначальнай у іх з'яўляецца праблема выбару. Да таго ж, у творах ваеннай тэматыкі, працягваючы традыцыю К. Чорнага, мастак даследаваў беларускі менталітэт і нацыянальны характар, выявіў народную сістэму аксіялагічных каштоўнасцяў.

Асэнсаванне тэмы вайны паступова перарастала ў летапіс жыцця беларускага народа на акупіраванай тэрыторыі, які асабліва ўзбагаціўся ў 1960-я гг. на хвалі «хрушчоўскай адлігі» з прыходам у літаратуру пісьменнікаў-«шасцідзесятнікаў». Са старонак кніг І. Пташнікава, Б. Сачанкі, Я. Сіпакова, М. Стральцова, І. Чыгрынава, В. Адамчыка і інш. паўстае жудасны прывід вайны і знявечанай беларускай зямлі, занатаваны памяццю дзяцей і падлеткаў, якія «рана сталелі ў зямлянках сырых». Гэта пакаленне амаль чатыры дзесяцігоддзі не сыходзіла з магістральных шляхоў развіцця нацыянальнай літаратуры і адыграла выключную ролю ў яе развіцці. «Шасцідзесятнікі» былі «дзецьмі вайны», таму ваенная тэма стала заканамернай ў іх творчасці. Але ў кожнага з пісьменнікаў гэтага пакалення была «свая» вайна, таму кожны з іх занатаваў гэтую «сваю» вайну. А. Адамовіч у дылогіі «Партизаны», якую склалі рускамоўныя раманы «Война под крышами» (1960) і «Сыновья уходят в бой» (1963), напісаў пра масавае супраціўленне акупантам мірнага насельніцтва, у якім удзельнічалі старыя, дзеці, жанчыны. Пісьменніку ўдалося такім чынам занатаваць «вайну пад стрэхамі». Б. Сачанка першым у беларускай літаратуры адкрыў тэму хатыняў у аповесці «Апошнія і першыя» (1968) і тэму палону ў аповесцях «Палон», «Аксана» (1971), рамане «Чужое неба» (1975). І. Пташнікаў працягнуў тэму спаленых вёсак у глыбока трагічнай аповесці «Тартак» (1968), даследаваў вытокі гераізму савецкіх людзей у аповесці «Найдорф» (1976). Творы пісьменніка вызначаюцца народным поглядам на вайну. І. Пташнікаву ўдалося паказаць, што са смерцю кожнага чалавека страчваецца цэлы свет, непаўторны ў сваім выяўленні. І. Чыгрынаў у пенталогіі «Плач перапёлкі» (1972–1996) засяродзіўся на паказе пачатку Вялікай Айчыннай вайны, лёсу мірных жыхароў на акупіраванай тэрыторыі, лёсу акружэнцаў, спалучыўшы ваенную тэму з асэнсаваннем драматызму сталінскіх рэпрэсій. В. Адамчык у рамане «Голас крыві брата твайго» (1990) паказаў вайну на тэрыторыі былой Заходняй Беларусі і засведчыў, што для беларусаў яна была не толькі айчыннай, але і грамадзянскай, калі свае забівалі сваіх.

Найбольш сурова вайна абышлася з В. Казько: нарадзіўся ў 1940 годзе, ад выбуху снараду загінула яго маці, а пры ёй замерзла сястрычка; праз усё жыццё пісьменнік пранёс комплекс віны за іх смерць. Гэтым комплексам часта надзелены і героі В. Казько. Асаблівасць ваеннай тэмы гэтага пісьменніка – у паказе яе праз дзіцячае ўспрыман-

не, сведчаннем чаго з'яўляюцца рускамоўная аповесць «Высокосный год» (1972) і першая беларускамоўная аповесць «Суд у Слабадзе» (1978).

Мастацка-гістарычны летапіс вайны, які пачаў М. Гарэцкі, у другой палове XX ст. быў дапоўнены дакументальна-мастацкімі творамі А. Адамовіча «Хатынская аповесць» (1972) і «Карнікі» (1980), А. Адамовіча Я. Брыля і У. Калесніка «Я з вогненнай вёскі…» (1975). Пра лёс жанчын і дзяцей на вайне дакументальна-мастацкія кнігі С. Алексіевіч «У вайны не жаночае аблічча» (1985) і «Апошнія сведкі» (1985).

Такім чынам, ваенная тэма ў беларускай літаратуры прайшла розныя перыяды свайго развіцця: заснаваная М. Гарэцкім на пачатку XX ст., мела працяг традыцыі паказу чалавека на вайне ў творчасці К. Чорнага; ад ідэалізаванага паказу гераічнага на вайне ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе прыйшла да праўдзівай «акопнай» праўды вайны «лейтэнанцкай» прозы (В. Быкаў і інш.) у 60−70-я гг. Гэта не толькі мастацкія творы, але і дакументальна-мастацкая проза, якую плённа ў другой палове XX ст. развівалі А. Адамовіч, Я. Брыль, У. Калеснік і С. Алексіевіч. Паколькі ў трагічным XX ст. на лёс беларусаў выпала шэраг войнаў (Першая сусветная, грамадзянская, Другая сусветная, Вялікая Айчынная, вайна ў Афганістане) і яны былі асэнсаваны беларускімі пісьменнікамі, то гэта ўсё ёсць творы ваеннай тэматыкі. І хоць большасць гэтых твораў прысвечана Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай вайне, але толькі імі, як гэта зрабіла А. Бязлепкіна, на наш погляд, абмяжоўваць нацыянальную ваенную прозу неправамерна.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Бязлепкіна, А. Ваенная проза / А. Бязлепкіна // 100 слоў пра сучасную беларускую літаратуру. – Мінск : Лімарыус, 2012. – С. 35–37.

2. Военная проза [Электронны рэсурс]. − Рэжым доступу: http://rpp.nashaucheba.ru /docs/ index_118371.html. – Дата доступу: 12.02.2015.

3. Каваленка, В. Міхась Лынькоў / В. Каваленка // Гісторыя беларускай літаратуры XX ст. : у 4 т. / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы. – 2-е выд. – Мінск, 2002. – Т. 2. – С. 370–412.

4. Калеснік, У. Янка Брыль: Нарыс жыцця і творчасці / У. Калеснік. – Мінск : Нар. асвета, 1990. – 256 с.

5. Мішчанчук, М. Кузьма Чорны. З верай у светлы дзень / М. Мішчанчук // Беларуская літаратура XX стагоддзя : вучэб. дапаможнік / М. І. Мішчанчук, І. С. Шпакоўскі. – Мінск, 2001. – С. 91–150.

6. Мушынскі, М. Максім Гарэцкі / М. Мушынскі // Гісторыя беларускай літаратуры XX ст. : у 4 т. / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы. – 2-е выд. – Мінск, 2001. – Т. 1. – С. 381–426.

7. Тычына, М. Кузьма Чорны / М. Тычына // Гісторыя беларускай літаратуры XX ст. : у 4 т. / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы. – 2-е выд. – Мінск, 2002. – Т. 2. – С. 330−369.

8. Чорны, К. Выбраныя творы / К. Чорны ; уклад. і прадм. М. Тычыны ; камент. М. Тычыны, Я. Янушкевіч. – Мінск : Беллітфонд, 2000. – 608 с.

9. Яскевіч, А. С. Проза першага пасляваеннага дзесяцігоддзя / А. С. Яскевіч // Гісторыя беларускай літаратуры XX ст. : у 4 т. / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы. – 2-е выд. – Мінск, 2002. – Т. 3. С. 55–80.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 06.05.2016

***Kavalyuk A.S.*** **Belarus Military Prose of the Twentieth Century: Genesis, Strategy of Artistic Typing, Problems of Interpretation**

*The article investigates the genesis, strategies of artistic typing of Belarusian military prose of the twentieth century, its interpretation by contemporary literary critics is highlighted.*